Пракурору г. Баранавічы Смаль А.П.
ад назіральніка ГА ПЦ „Вясна" на
выбарчым участку № 29
Бліңкоўскага Аркадзія Аляксандравіча
(т.х. 47-25-07).

Заява.

Праходзіўшыя выбары ў мясцовыя органы ўлады
праходзілі пад вялікім уціскам насельніцтва з боку
начальнікаў рознага напрамку і ўзроўню.
Фактычна гэты ўціск перарос у звычайны тэра-
рызм. (Террор - политика устранения политических
противников вплоть до их физического истребления).
БСЭ. Энциклопедический словарь 1955 г.)

Народ не прымае ўладу, а ўлада метадам
тэрора прымушае народ ісці на выбарчыя ўчасткі
і кідаць бюлетэні, а потым вынікі фальсіфіцыруюц-
ца ў неабходных напрамках.

Факты прымуса - тэрора:

1. 26-29.02.2003 г. у 11 гадзін старшыня ўчастка № 24
Арцыменя ў зале для галасавання паведаміў
старшыні выбарчага ўчастка № 29 Шода С.Е., што
па яго звесткам Шода яшчэ не прагаласаваў
і адправіў яго галасаваць. Працэс суправаджаў-
ся здзеклівым тлумачэннем, што ён можа
забыць падпісаць паперу на прэмію.
Больш таго, пры наведванні ўчасткаў № 29 і № 24
начальнікам КДБ П. Валушчыкам на мае заўвагі,
што Арцыменя парушае закон, Арцыменя пачаў
даказваць, што ён мае права ўціску.

2. У час галасавання — 02.03.2003 года я сяджу на месцы назіральнікаў. Падходзіць мужчына, прагаласаваўшы на ўчастку № 24 і ў нас заводзіцца размова:

Ён — Вы представитель „Атланта"?

Я — А што?

Ён — вам аддаваць? (і паказвае паперку, якая дадаецца да заявы).

Я — Давайце.

У паперцы пазначана: БЗС. ЗАО АТЛАНТ. цех 320 Арцименя Сергей Михайлович.

Сведка: Севярцаў М.А. (т.41-47-09) пацвердзіць, што прыносілі з ЗАО Атлант канверт для збора такіх паперак камісіямі і перадачы іх назад для кантроля і насілля над непрагаласаваўшымі. Маёр міліцыі таксама гэта можа падцвердзіць.

Гэта парушэнне Выбарчага кодэкса РБ арт. 5 і артыкула 65 Канстытуцыі РБ.

Факты прымусовага галасавання відны па выніках галасавання на выбарчым участку № 29.

За Ваньковіча (іщаў аддзін) прагаласавала 520 выбаршчыкаў, супраць — 424. За Сокала — Мезяка падоўжана супраць (абодвух) 213 галасоў. У той жа час на уч. № 28 няма галасоў супраць абодвух, што сведчыць аб фальсіфікацыі вынікаў галасавання. Сацыялагічная навука не прызнае такіх вынікаў.

Прашу расследаваць вышэйуказаныя факты.

Да заявы дадаецца: паперка з ЗАО „Атлант".

Назіральнік ГА ПЦ „Вясна" А. Блінкоўскі

Сведка (давераная асоба) М.А. Севярцаў